**УДК 72.05:296.735(476.6)**

# КАСЦЁЛ СВ. МІХАІЛА АРХАНЁЛА Ў СМАРНОНІ: ГІСТОРЫЯ І АРХІТЭКТУРНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ

***М.К. ШАЎЛІС***
***(Прадстаўлена: канд. гіст. навук, дац. У.Я. АЎСЕЙЧЫК)***

Смаргонь — даўняе мястэчка гістарычнай Ашмяншчыны (частка Віленшчыны) [1]. Упершыню Смаргонь упамінаецца ў дакументах па гісторыі Вілейскай епархіі ў 1503 г. Вядомая як прыватнае мястэчка ў ВКЛ, уласнасць Зяновічаў, Радзівілаў, Пшаздзецкіх. Звалася таксама Смургоні, у 19 ст. Смаргоні. У 1552 тут заснаваны кальвінісцкі збор. З 1590 пачалі працаваць папяровая мануфактура, школа, шпіталь. У Смаргоні ўпершыню сталі выпякаць абаранкі (смаргонкі). У 17 ст. Радзівілы заснавалі так званую «Смаргонскую акадэмію» [2] – жартоўная назва промыслу па лоўлі і дрэсіроўцы мядзведзяў. З 1795 Смаргонь у складзе Расійскай імперыі. У час вайны 1812 пры адступленні французскіх войскаў тут спыняўся Напалеон, перадаў камандаванне маршалу І. Мюрату і з'ехаў уПарыж. З таго часу дарогу Смаргонь—Ашмяны завуць Напалеонаўскай дарогай. У 1-ую сусветную вайну праз Смаргонь праходзіла лінія фронту, паселішча было разбурана. У 1920–1922 Смаргонь увайшла ў склад Сярэдняй Літвы, з 1922 – Польшчы. З 1939 у БССР, з 1940 горад, цэнтр раёна.

Галоўнай славутасцю Смаргоні з’яўляецца архітэктурны помнік XVI ст. Кальвінскі збор. Гэта адзін з цікавейшых помнікаў ранняга рэнесансу Беларусі (мал.1).



Мал. 1. Сучасны выгляд касцёла св. Міхаіла Арханёла

Калі у XVI ст. у Еўропе пачала распаўсюджвацца новая рэлігійная плынь – рэфармацыя, многія магнаты сталі кальвіністамі. Сярод іх былі Юрый Зяновіч (каля 1510–1583) і яго сын Хрыстафор (каля 1540–1614), уладары Смаргоні.

Менавіта Хрыстафор Зяновіч заклаў падмурак будучага храма, а яго сын Юрый завяршыў будаўніцтва ў сярэдзіне 50-х гадоў XVI стагоддзя. Больш дакладную дату завяршэння будаўніцтва назваць цяжка, бо яна розная ў розных даследчыкаў – 1553, 1555, 1558 гг. і іншыя. Але гэтыя звесткі тычацца больш ранніх драўляных храмаў. Даследаванні беларускіх рэстаўратараў паказалі, што культавы будынак, які захаваўся да нашых дзён, быў узведзены ў 1606–1612 гг. як кальвінскі збор Мікалаем Багуславам Зяновічам, а ў 1621 г. Сафіяй (з Зяновічаў) перададзены пад касцёл і асвечаны ў гонар Св. Тройцы, у 1866 г. прыстасаваны пад праваслаўную Мікалаеўскую царкву, у 1923–1925 і ў 1970-я гг. рэстаўрыраваны [3].

Унутраная прастора храма ўяўляе сабою круглую залу, перакрытую сферычным купалам. Аднак звонку яна «апранута» ў нероўнабаковы васьміgranны аб'ём: з поўдня і поўначы яго грані ўдвая большыя за астатнія і маюць па два светлавыя праёмы, іншыя — па аднаму (мал. 2). Гэта надае асноўнаму аб'ёму храма пры агульнай кампактнасці мас нязначную падоўжнасць па восі ўсход—захад. Каб схаваць неадпаведнасць геаметрычных форм інтэр'ера і вонкавай кампазіцыі, таўшчыня сцен будынка дасягае ў вузлавых месцах 3 м. У той жа час, каб знізіць масіўнасць канструкцый і павялічыць унутраную прастору, сцены раскрапаваны глыбокімі паўцыркульнымі арачнымі нішамі, якія дазваляюць ажыццявіць лагічны

канструкцыйны пераход да круга ў аснаванні купала. На скошаных гранях іх дапаўняюць вытанчаныя высокія конхавыя нішы-табернакулы, што падкрэслівае рэнесансны характар інтэр'ера.

Ніжняя частка купала звонку закрыта таксама нероўнабаковым васьмігранным дэкаратыўным атыкам. Па сваёй канструкцыі ён не прыстасаваны да абарончых функцый. Атык аздабляе прыгожая готыка-рэнесансная аркатура, імпасты якой аформлены ў выглядзе кароткіх пілястраў, прычым на бакавых фасадах размешчана па чатыры падвойныя арачныя нішы, а на астатніх — па дзве. Відавочна, што пры цэнтрычнасці ўнутранага купала вянчаючыя масы звонку захоўвалі агульную падоўжнасць кампазіцыі. Выклікае пытанне аўтэнтычны характар завяршэння атыка і пакрыцця купала. Падчас рэстаўрацыі збора ў 1970-я гг. яму нададзена нероўнабаковае васьмісхільнае шатровае пакрыццё — на папярэднім этапе яно мела невялікі падоўжны вільчык, — было вальмавым. На больш ранніх здымках пачатку XX ст. і малюнках другой паловы XIX ст. бачна, што на той час храм завяршаўся самкнутым нероўнабаковым васьмічасткавым купалам з ліхтарыкам у цэнтры. Гэтая форма пакрыцця найбольш блізкая да першапачатковай, бо адтуліна ў апеоне сферы ўнутранага купала мае перадумовай верхняе асвятленне інтэр'ера з дапамогай светлавога ліхтарыка, да таго ж больш адпавядае рэнесанснай архітэктуры храма, вырашанага накшталт шматлікіх купальных пахавальных капліц, распаўсюджаных у Рэчы Паспалітай у гэты перыяд. Пад храмам знаходзіцца крыпта для пахаванняў.

Тое, што смаргонскі кальвінскі збор вырашаны менавіта накшталт капліцы і алтарная частка ў ім адсутнічае, невыпадкова і мае пэўнае канфесійна-ідэалагічнае абгрунтаванне: у рэфармацкіх храмах акцэнт робіцца не на алтары, а на кафедры прапаведніка. Адзін з трох галоўных прынцыпаў пратэстантызму — свяшчэнства ўсіх дарослых, хрышчаных па веры. Пратэстантызм таксама адмаўляе некаторыя рэлігійныя таінствы, акрамя хрышчэння і св. камуніі (у некаторых кірунках дапускаецца споведзь). Гэтыя палажэнні, у сваю чаргу, адмаўляюць неабходнасць алтара як сакральнага месца для святара (знайшло адлюстраванне ў архітэктуры рэфармацкіх храмаў разглядаемага перыяду). Відавочна, што і сакрыстыя была прыбудавана да асноўнага аб'ёму з паўночнага боку пры прыстасаванні кальвінскага збора пад касцёл.



Мал. 2. Галоўны алтар касцёла св. Міхаіла Арханёла

Кампактная, блізкая да цэнтрычнай, купальная кампазіцыя храма ад пачатку была парушана прыбудовай да заходняй грані васьміграннага асноўнага аб'ёму роўнага з ім па шырыні і вышыні квадратнага ў плане ўваходнага аб'ёму, на другім ярусе якога, перакрытым крыжовым скляпеннем, размешчаны хоры. Сцены ўваходнага аб'ёму таксама надзвычай масіўныя, таму што да 1866 г. над ім узвышаліся яшчэ тры васьмігранныя ярусы вежы-званіцы, з якіх ацалеў толькі адзін. Каб трапіць на верхнія ярусы вежы-званіцы, не паслабляючы яе канструкцыйную трываласць, побач з ёй прыбудавана круглая гатычная вежачка з вітымі ўсходамі. Верагодна, смаргонскі кальвінскі збор меў яшчэ адну, круглую вежачку з паўночнага боку цэнтральнай вежы і яго ўваходная частка першапачаткова мела кампазіцыю, аналагічную Мікалаеўскаму касцёлу ў Міры. Архітэктурна-мастацтвазнаўчы аналіз форм і канструкцый збудавання сведчыць, што і надзвычайная масіўнасць сцен, і двухвежавае вырашэнне ўваходнай часткі, і кампазіцыя кафалікона маюць пераважна мастацка-стылявыя і канфесійна-ідэалагічныя карані.

З 1805 г. ў валоданне Смаргонню ўступіў князь Багдан Агінскі, які пасля пажару Смаргоні у 1806 г. вярнуў частку касцельных участкаў у падвойным памеры [4].

Пасля паражэння паўстання супраць царызму ў 1863 годзе каталіцкія касцёлы амаль паўсюдна пераўтвараліся ў праваслаўныя цэрквы. І ў Смаргоні з 1866 г., замест касцёла Святой Троіцы была ўжо

Міхайлаўская царква. Аздобы касцёла былі ліквідаваны, фрэскі забелены, і ўсталявана шатровая страха з макаўкай у рускім стылі. Да 1918 года храм быў праваслаўным, хаця ў гады Першай сусветнай вайны служба тут не вялася.

Доўгі час смаргонскія каталікі не мелі ўласнай святыні. Аднак, як толькі з'явіўся талерантны маніфест 1905 г., адрадзілася і смаргонская парафія. У 1911 г. на рагу Мінскай і Вілейскай вуліц намаганнямі кс. Станіслава Кліма і кс. Юстына Пятранаса быў пабудаваны новы манументальны цагляны касцёл у неараманскім стылі. Новазбудаваную святыню асвяцілі пад старым парафіяльным тытулам св. Міхала Арханёла. Гэта была дзвюхвежавая трохнававая базіліка з трансептам. Амаль трыццаціметровыя чатырох'ярусныя вежы, квадратныя ў сячэнні, былі завершаны шматграннымі шатрамі. На адной з іх планавалася ўсталяваць гадзіннік, а ў другой зрабіць званіцу. На жаль, у час Першай сусветнай вайны новы касцёл быў дашчэнту зруйнаваны. Сёння на гэтым месцы стаіць жылы дом.

У 1920 г. стары храм зноў вярнулі каталіцкай суполцы і асвяцілі пад гістарычным тытулам св. Міхала Арханёла. У 1925 г. святыня ў чарговы раз была рэканструявана: псеўдарускі дэкор і цыбулепадобныя галоўкі былі разабраны і заменены на формы, характэрныя для касцёльнага дойлідства. У 1936 г. купал і часткова сцены касцёла былі распісаны знакамітым мастаком Пётрай Сергіевічам. Сярод фрэсак асабліва вылучаліся "Выгнанне з Раю", "Св. Крыштаф", "Св. Станіслаў біскуп", "За польскім часам" колькасць смаргонскіх парафіян перавышала 4000, да парафіі прыпісвалася толькі капліца ў Залессі.

У 1947 г. касцёл быў зачынены і прыстасаваны спачатку пад склад, потым пад магазін, а пасля рэстаўрацыі 1970 г. – пад выставачную залу і аб'яўлены помнікам архітэктуры рэспубліканскага значэння.

З сакавіка 1990 г. святыня зноў дзейнічае як каталіцкі касцёл св. Міхаіла Арханёла. Старажытныя фрэскі і роспісы П. Сергіевіча не захаваліся (былі знішчаны ў пасляваенныя гады). Новае абсталяванне святыні – алтарную кампазіцыю, новыя роспісы на скляпенні купала – стварыў кс. Тадэвуш Фурдына SDB, вядомы мастак салезіянін.

Аб'ёмна-прасторавая структура робіць смаргонскі кальвінскі збор найбольш тыповай рэнесанснай пабудовай Беларусі. Класічныя ўзоры архітэктуры эпохі Рэнесанса характарызуюцца ўраўнаважанасцю прасторы і масы, раўназначнасцю ўсіх фасадаў (найлепей дасягаецца пры цэнтрычнай кампазіцыі збудаванняў). У арганізацыі мас да іх набліжаецца і смаргонскі помнік, але яго кампазіцыя пад уплывам традыцый мясцовага храмабудаўніцтва не вытрымана паслядоўна цэнтрычнай.

ЛІТАРАТУРА


1. Ганчароў, А. Смаргонь / А. Ганчароў // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. Т. 6. Кн. 1 : Пузыны – Усая // рэдкал. : Г.П. Пашкоў (галоўны рэд.) [і інш.]; маст. Э.Э. Жакевіч. – Мінск : БелЭн. – 2001. – 365 с.
2. Кляшчонак, Т. Аб заснавальніку Смаргонскай Мядзведжай Акадэміі / Т. Кляшчонак //Рэгіянальная газета. – 2000. – 4 лют. – № 5 (250)
3. Касцёл Святога Міхала Арханёла. Смаргонь [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.radzima.org/be/object/1729.html. – Дата доступу: 26.09.2016.
4. Помнікі гісторыка-культурнай спадчыны [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://museumsmorgon.by/area_monuments.htm. – Дата доступу: 26.09.2016.